Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 11(289) | ПАНЯДЗЕЛАК, 22 красавіка 1957 г. | Цана 20 кап.

Сямён БЛАТУН

У РАЗЛІВЕ

Гарыць касцёр, патрэскваюць вуголлі,
Булькоча чайнік, мерна, неспяша.
Заснула ноч, спавіўшы наваколле,
І толькі ён не спіць ля шалаша.
Таропка піша у сшытак на калене,
Забыўшыся пра чай і пра агонь,
Ад працы зрэдку адарвецца Ленін,
Успыхнуць аганькі у вачах яго.
Ён у народ, ён у Расію верыць,—
І зноў бягуць з-пад ленінскай рукі,
Напісаныя цесна на паперы
Вялікай прауды і святла радкі.
Бягуць радкі, і пад рукой прывычна
Лісты у сшытку спісаным шуршаць...
І зарывам займаецца Кастрычнік
З маленькага кастра ля шалаша.

В. НІКОЛАЕНКО

ЛЕНИН ЖИВ

«Ленин жил,
Ленин жив,
Ленин будет жить!»
В. Маяковский.

Ленин жив. Он не умер.
Он с нами бессменно.
В нашей поступи сила и разум его.
Его голос набатом
Звучит над вселенной,
Утверждая свободы людской торжество.
Миру светят Кремлевские
Ясные зори.
Согревая и радуя юность земли.
Эти зори
В Семнадцатом
Пушки «Авроры»
Над планетою ленинским светом зажгли.

Адзначаючы 87-годдзе з дня нараджэння вялікага правадыра

Грамадскасць універсітэта шырока адзначае 87-годдзе з дня нараджэння заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы В. І. Леніна.

21-га красавіка ў клубе БДУ адбылося урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 87-ай гадавіне з дня нараджэння В. І. Леніна.

З дакладам «В. І. Ленін і навука» выступіў акадэмік Г. Ф. Аляксандраў.

Распрацавана і зацверджана партыйным камітэтам тэматыка лекцый і дакладаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці В. І. Леніна. На ўсіх факультэтах перад студэнтамі і выкладчыкамі выступяць лектары з дакладамі, у якіх раскажуць пра жыццё і дзейнасць вялікага правадыра працоўных.

Ва універсітэце будзе праведзена навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная памяці В. І. Леніна.

Выстаўка, прысвечаная В. І. Леніну

«Ленінізм — непераможны сцяг сучаснай эпохі»—так называецца выстаўка, арганізаваная ў чытальнай зале нашага універсітэта да 87-годдзя з дня нараджэння В. І. Леніна. Выстаўка складаецца з чатырох аддзелаў: «Успаміны», «В. І. Ленін і Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэволюцыя», «В. І. Ленін аб рашаючай ролі народа у будаўніцтве комунізма», «Ленінская палітыка міру і дружбы памiж народамі».

Багата прадстаулен на выстаўцы першы аддзел—«Успаміны». Тут знаходзяцца два зборнікі успамінаў аб В. І. Леніне. Сярод іншай літаратуры успаміны аб В. І. Леніне Клары Цэткін, «Вялікі Ленін»—Г. Кржыжаноускага, «Аб В. І. Леніне»—А. Андрэева.

У аддзеле «В. І. Ленін і Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэволюцыя» увазе наведвальнікаў—работы «Марксізм і паустанне», «Аб задачах пролетарыята у данай рэволюцыі», «Да лозунгаў», напісаныя Леніным напярэдадні Кастрычніка.

Аддзел «В. І. Ленін аб рашаючай ролі народа у будаўніцтве комунізма» расказвае аб барацьбе В. І. Леніна за пабудову комуністычнага грамадства у нашай краіне, аб першых крokах малодой совецкай рэспублікі. Тут прадстаулены работы, напісаныя В. І. Леніным пасля Кастрычніцкай рэволюцыі у апошнія дні жыцця: «Вялікі пачын», «Старонкі з дзённіка», «Аб кааперацыі» і іншыя.

Выконваючы запаветы вялікага Леніна, наша краіна адстойвае ідэі міру і дружбы паміж народамі усяго свету, узначальвае магутны лагер барацьбітоў за мір і прагрэс чалавецтва. Аб гэтым і расказвае апошні аддзел выстаўкі.

У РАБОЧЫМ КАБІНЕЦЕ В. І. ЛЕНІНА

Масква. Крэмль. Будынак Совета Міністраў СССР. Тут, на трэцім паверсе знаходзіцца рабочы кабінет і кватэра В. І. Леніна.

Цераз невялікую прыхожую уваходзім у светлы пакой. Уздоўж сцен — паліцы з кнігамі, з падшыўкамі газет, карты. Рабочы стол, крэсла з пляцёнай спінкай, знаёмае усім нам па вядомай фатаграфіі. На стале просты пісьмовы прыбор, алоукі, бланкі з грыфам «Старшыня Совета Народных Камісараў», нож для разразання кніг, нажніцы, якімі Владзімір Ільіч разразаў канверты. Здаецца, што гаспадар толькі што пакінуў кабінет па якой-небудзь неадкладнай справе. Але не. Ніколі у кабінеце Леніна не было такога музейнага парадку...

Гэта быў рабочы кабінет, у якім вялікі заснавальнік совецкай дзяржавы пісаў свае творы і прымаў шматлікіх наведвальнікаў. Гэта быў рабочы кабінет, звязаны дзесяткамі тэлефонных правадоў з усёй краінай, з усімі франтамі грамадзянскай вайны. Гэта быў рабочы кабінет, адкуль В. І. Ленін выходзіў у суседнюю пакой, дзе адбываліся гістарычныя пасяджэнні Совета Народных Камісараў, дзе адбываюцца цяпер пасяджэнні Совета Міністраў СССР.

Усё у кабінеце прыстасавана для напружанай разумовай працы. На паліцах — кнігі Маркса, Энгельса і другіх дзеячоў сусветнага вызваленчага руху, творы класікаў рускай і зарубежнай літаратуры, творы сучасных Леніну совецкіх і замежных аўтараў. З правага боку ад крэсла стаіць этажэрка-вяртушка. На ёй размешчаны кнігі, якія Владзімір Ільіч лічыў патрэбным мець заўсёды пад рукой. Цікава адзначыць, што сярод гэтых неабходных кніг знаходзіцца і чатырохтомны слоўнік Даля. Паводле слоў Бонч-Бруевіча, які быў у той час упраўляючым справамі Соўнаркома, Ленін пастаянна вывучаў гэты слоўнік, вельмі цікавіўся прыказкамі, прымаўкамі і іншымі вобразнымі выражэннямі рускай мовы, якія там прыведзены. Іменна пад уплывам вывучэння слоўніка Даля В. І. Ленін напісаў вядомую запіску А. В. Луначарскаму, у якой выказаў ідэю стварэння новага слоўніка літаратурнай мовы ад Пушкіна да Горкага. Аб неабходнасці стварэння такога слоўніка Владзімір Ільіч напамінаў потым неаднаразова. Той факт, што вялікі правадыр рабочага класа знаходзіў час займацца пытаннямі мовы у цяжкія гады грамадзянскай вайны і наступіўшай пасля яе разрухай, шмат аб чым гаворыць нам, філолагам, журналістам.

На прасценку, паміж двума вокнамі вісіць вялікая карта шляхоў зносін еўрапейскай і азіяцкай частак Расіі. На ёй чырвонымі істужкамі адзначалася лінія франтоў грамадзянскай вайны. Каля сцяны канапа, на паліцы якой стаіць барэльеф Сцяпана Хаутурына, партрэт Карла Маркса, які падарылі Леніну рабочыя Петраграда у 1918 годзе. Цікава адзначыць, што дэлегацыя піцерскіх рабочых, якая прывезла гэты партрэт у Маскву, хацела уручыць яго Владзіміру Ільічу ва ўрачыстай абстаноуцы, з абавязковымі прамовамі аб выдатных заслугах Леніна перад партыяй і рабочым класам. Але Владзімір Ільіч пасадзіў дэлегатаў у мяккія скураныя крэслы і папрасіў іх лепш расказаць аб жыцці рабочых рэволюцыйнага Петраграда. Гэты факт лішні раз сведчыць аб вядомай усяму свету сціпласці Леніна, яго нялюбві да пампезнасці, напышлівасці, да урачыстага усхвалення яго асобы.

В. І. Ленін працаваў у гэтым кабінеце з сакавіка 1918 года па снежань 1922. Цяжка пералічыць усе тыя важныя пытанні, якія ставіліся і вырашаліся у гэтым пакоі, у гэтай залі, дзе адбываліся пасяджэнні Совета Народных Камісараў. Тут Ленін дыктаваў свой накід артыкула «Чарговыя задачы совецкай улады», тут ён абдумваў праблемы сацыялістычнага спаборніцтва, змагаўся супроць ворагаў партыі—левых эсэраў, трацкістаў, меншавікоў; тут быў распрацаван велічны план электрыфікацыі Совецкай Расіі, адсюль даваліся ўказанні па барацьбе з інтэрвентамі і белагвардзейшчынай...

Усё, што звязана з вялікім жыццём і працай Владзіміра Ільіча Леніна, бясконца дарага совецкаму народу. Блізкія і дарагія нам і тыя пакоі у старажытным Крэмлі, у якіх жыў і працаваў Владзімір Ільіч у адзін з самых важных этапаў сацыялістычнай рэволюцыі.

М. ЦІКОЦКІ.

ШТРИХИ ВЕЛИКОГО ПОРТРЕТА

Из рассказа Вадима Александровича Смольянинова—члена партии с 1908 года. С апреля 1921 года он работал помощником управляющего Совнаркома и Совета Труда и Обороны, а затем управляющим делами СТО.

... У Владимира Ильича было много источников, по которым он следил за жизнью страны, и среди них самый, пожалуй, любимый—газеты. День он начинал с чтения прессы. Приходя утром на работу, Ильич приносил с собой толстую папку прочитанных за завтраком газет. И каждая из них была испещрена карандашными подчеркиваниями, восклицательными и вопросительными знаками, стрелками, кружками и характерными ильичевскими пометками вроде «NB», «гм-гм!», «верно!». Как он успевал прочесть за каких-нибудь полчаса! Ильич читал удивительно быстро и весьма своеобразно: не от строки к строке, а как бы охватывая глазами всю страницу целиком. Помню, я принес ему только что полученную из-за границы книгу американского селекционера Лютера Бербанка «Жатва жизни». Ильич сразу при мне прочитал ее, стремительно перелистывая страницы. Именно прочитал, а не просмотрел, и тут же начал подробно комментировать труд Бербанка, пересказывая при этом содержание и излагая мысль автора. Книга понравилась Ленину. Он сказал: «Пошлите в госиздат. Пусть переведут и побыстрее напечатают».

Так вот, о газетах...

В один из первых дней моей работы в Совнаркоме Ильич, когда я пришел к нему с докладом по какому-то вопросу, протянул мне свежий номер «Известий»—и спросил: «Читали?» «Нет,—сказал я,—еще не успел, Владимир Ильич». «Жаль, я думал, что вы уже обратили внимание вот на эту статейку.—И он ткнул карандашом в отчеркнутый жирной чертой фельетон на второй странице.—Прочитайте, пригласите автора, расспросите у него подробности». Ильич никогда не говорил «вызовите»; говорил: «пригласите». «А потом, — продолжал он, — свяжитесь с Наро-Фоминском. Возмутительное развели там безобразие! Завтра же жду от вас обстоятельной информации по этому поводу». В фельетоне говорилось о Наро-Фоминской текстильной фабрике, которая вот уже третью неделю простаивает из-за отсутствия топлива. А дрова, как пишет газета, лежат в пятистах метрах на берегу реки... У меня побывал автор фельетона. Я позвонил в Главтекстиль, и оттуда сообщили, что директору «давно даны соответствующие указания». А директор сослался на городской Совет, который не высылает подвод для вывозки топлива. Председатель же горсовета пожаловался на директора, который не переводит денег в банк... Звонки из Совнаркома, «от Ленина», возымели свое действие, и на другой день я докладывал Ильичу, что дрова доставлены и фабрика пущена. «Ах, волокитчики! Ах, канительщики!—возмущался Ильич, выслушав мой рассказ о наро-фоминских «порядках».—Под суд бы их!» Так впервые высказал он при мне мысль о суде над бюрократами и волокитчиками, к которой не раз потом возвращался.

Волокита, бюрократизм, равнодушие вызывали у Ильича негодование.

У меня на памяти такой случай. В Совнарком пришла телеграфная жалоба из какой-то воинской части, которой по вине снабжающих органов недодали хлеба. По указанию Ильича я направил эту телеграмму народному комиссару продовольствия. И предупредил его по телефону, что Ленин требует немедленной отгрузки хлеба. Прошло три дня. Из Наркомпрода «ни ответа, ни привета». Звоню наркому. «Все,—говорит,—в порядке. Телеграмму я сразу же передал моему заместителю. Он должен был принять меры». Звоню заму. «Знаю, знаю,—говорит.—Мною дано указание хлебному отделу». Звоню начальнику хлебного отдела. «Телеграмма у исполнителя такого-то». Дозвонился я и до исполнителя. Хлеб оказывается до сих пор не отгружен... Узнав об этом, Ленин возмутился и поручил заместителю наркома РКИ В. А. Аванесову провести в Наркомпроде срочное расследование волокиты. И вот на заседании Совета Труда и Обороны Аванесов докладывает о результатах проверки. Да, телеграмма действительно ходила по канцеляриям три дня. Но виновников, собственно ,нет: бумага ни у кого не залеживалась, а шла нормально по инстанциям. «Как вы говорите? Нормально?» — переспросил Ленин и в зале послышался смешок. Но Ильич нахмурился, в глазах у него метнулись грозные искорки, и стало понятно, что сейчас не до шуток. Все притихли. «Формально нормально,—сказал Владимир Ильич,—а по существу издевательство. Вот бы любого норкомпродовского волокитчика в солдатскую шкуру и с пустым брюхом в караул... Травить, судить будем за волокиту!»

Ильичу претили всякого рода бюрократическое высокомерие, зазнайство, проявляющиеся у отдельных работников. Он называл таких «чиновниками с пышными советскими титулами» и клеймил их беспощадно. Мне довелось быть свидетелем, как Ильич обрушился во время заседания Совнаркома на председателя правления Государственного банка. Это был самонадеянный, преисполненный амбиции человек. Вел он себя вызывающе. Вот и на этот раз, оставшись недовольным каким-то решением, он демонстративно захлопнул с шумом портфель, встал и направился к двери. Но был остановлен резким окриком Ленина: «Вернитесь! Сядьте!» Этому гневному голосу нельзя было не подчиниться. Я еще никогда не видел Ленина таким. «Кто вы такой?—сказал Ленин.—Откуда у нас эта чванливость, эти повадки вельможи? Народ посадил вас в государственное кресло. Но он же, народ, может и дать вам пинка...» Кое-кто из присутствовавших на заседании счел потом, что Владимир Ильич слишком-де резко обошелся с председателем Госбанка. А я думаю, что Ленин уже тогда со свойственным ему удивительным проникновением в сущность человека распознал в этом «деятеле» отвратительные черты, которые позже развились и толкнули на путь измены: очутившись в заграничной командировке, он не вернулся на родину...

... Ильич как-то сказал мне: «К вам поступила жалоба, просьба. Так вообразите же себя на месте жалобщика, постарайтесь душой, сердцем понять его положение. Сочтите, что это вам не отвечают на заявление, что это вас не допускают к начальству, к которому вы стремитесь попасть. Или вот человек просит квартиру. Поднатужьтесь, напрягите всю свою фантазию и картинно представьте себе, что это у вас нет квартиры, что это вы скитаетесь с семьей по углам... И тогда вы наверняка найдете возможность помочь просителю. Это не филантропия: это коммунистический подход к человеку».

Паведамленне аб звяржэнні самадзяржаўя у Мінску атрымана 1 сакавіка.

**

17 сакавіка Мінскі Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў рашэнне аб увядзенні 8-гадзіннага рабочага дня.

**

20 сакавіка ў Мінску адкрыўся Першы франтавы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў тыла і арміі Заходняга фронта. Прысутнічалі на з'ездзе М. В. Фрунзе, А. Ф. Мясніkоў. Ад ЦК РСДРП прысутнічаў А. Е. Бадаеў. З'езд рэзка асудзіў паклёп і нападкі на рабочы клас у сувязі з барацьбой за 8-гадзінны рабочы дзень і паляпшэнне матэрыяльнага становішча.

Быў таксама зацверджан праект арганізацыі салдат на фронце.

З'езд адыграў станоўчую ролю ў справе умацавання сувязей большэвікоў Мінска з салдатамі Заходняга фронта.

**

23 сакавіка адбылося пасяджэнне групы сялянскіх дэпутатаў, якія прыехалі ў Мінск для удзелу ў выбарах губернскага харчовага камітэта. Быў абран губернскі сялянскі камітэт, старшынёй якога стаў М. В. Фрунзе.

**

Мінскі Совет 22 красавіка прыняў рашэнне, асуджаючае імперыялістычную палітыку Часовага урада ў сувязі з нотай Мілюкова. На прадпрыемствах горада і у вайсковых часцях гарнізона пад кіраўніцтвам большэвікоў былі праведзены шматлікія мітынгі пратэсту.

Камітэт салдацкіх дэпутатаў 16-га грэнадзёрскага Мінгрэльскага палка пісаў у сваёй рэзалюцыі: «Мы патрабуем ад Часовага урада узяць сваю ноту назад і адмовіцца ад захопніцкай палітыкі. Разам з усёй соцыял-дэмакратыяй мы ва ўвесь голас заяўляем:далоў імперыялістаў! Няхай жыве мір і брацтва народаў!»

**

20 красавіка большэвікі з дапамогай Мінскага Совета склікалі сялянскі з'езд Мінскай і часткі Віленскай губерній. На з'езд прыехала звыш 800 дэлегатаў.

На з'ездзе абмяркоўваліся пытанні: аб вайне і міры, аб адносінах да Часовага урада, нацыянальнае пытанне, арганізацыя мясцовага самакіравання і іншыя. З'езд рашыў дабіцца таго, каб усе землі: царкоўныя, манастырскія, казённыя, памешчыцкія—зрабіліся агульнанародным здабыткам без усякага выкупа. Прыватная уласнасць на зямлю павінна быць назаўсёды адменена і зямля не можа ні прадавацца, ні купляцца.

6 мая з'езд абрау Выканаўчы камітэт сялянскіх дэпутатаў і перадаў старшынства ў ім большэвіку М. В. Фрунзе.

В. І. Ленін у Кастрычніцкія дні.

АДЗІНСТВА ПАРТЫІ І НАРОДА

МЫ — ЗА!

Адзінадушша, з якім усе студэнты і выкладчыкі універсітэта падтрымліваюць прапанову аб спыненні з 1958 года падпіскі на пазыку, а таксама аб спыненні выплат па ўсіх пазыках, гаворыць аб тым, што яна адлюстроўвае інтарэсы народа.

Гарачую падтрымку гэтая прапанова атрымала і сярод калектыву біёлага-глебавага факультэта. На мітынгу студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу з інфармацыяй выступіў дацэнт С. П. Рагожын.

— Усім нам вядома, куды пойдуць сродкі ад пазык,—сказаў ён.—На нашых вачах расце і харашэе сталіца Беларусі. За апошнія гады пабудаваны дзесяткі новых дамоў, культурна-асветных устаноў і г. д. Жыццё працоўных з кожным днём становіцца усё лепш. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што партыя і совецкі ўрад клопаты аб добрабыце народа ставяць вышэй за усё.

— Спыненне выплат выйгрышаў,—сказала выступіўшая на мітынгу старшая лабарантка П. Г. Лазавая,—дазволіць дзяржаве накіраваць гэтыя сродкі на будаўніцтва новых школ, клубаў, жылых дамоў і г. д. Я падтрымліваю прапанову нашага урада.

На мітынгу выступілі таксама дацэнт С. В. Калішэвіч, лабарантка М. Н. Гуткова. Студэнты і выкладчыкі аднадушна падтрымалі ініцыятыву гаркаўчан.

СВАЁЙ ДЗЯРЖАВЕ

Аднадушна падтрымалі прапанову партыі і урада па дзяржаўных пазыках студэнты і выкладчыкі юрыдычнага факультэта.

Тут днямі адбыўся мітынг, на якім выступілі студэнт II курса А. Вайценка, выкладчык П. І. Гавзе і другія.

У сваіх выступленнях яны выказалі думкі усіх прысутных аб тым, што мерапрыемствы па дзяржаўных пазыках адпавядаюць інтарэсам народа, а таму так горача яны і падтрымліваюцца.

НА КАРЫСЦЬ РАДЗІМЕ

Мітынг, прысвечаны абмеркаванню прапаноў ЦК КПСС і Совецкага урада па дзяржаўных пазыках, прайшоў у выдавецтве і друкарні універсітэта. Адкрываючы яго, старшыня профгрупы друкар **А. Навіцкі** коратка расказаў аб прамове **Н. С. Хрушчова** перад працоўнымі горада Горкага, як совецкія людзі ўсюды з вялікім уздымам падтрымліваюць прапанову аб спыненні з 1958 года падпіскі на пазыку і аб скарачэнні сумы падпіскі на пазыку 1957 г. да 12 мільярдаў рублёў.

Выступіўшыя на мітынгу карэктар **Е. Мішанава** і дырэктар выдавецтва **А. Кручкоў**, гаварылі аб тым, што прапановы адносна дзяржаўных пазык адказваюць кроўным інтарэсам сацыялістычнай дзяржавы і ўсяго совецкага народа. Яны заклікалі ўсіх рабочых і служачых калектыва выдавецтва і друкарні падтрымаць гэтыя прапановы.

На мітынгу была аднадушна прынята рэзалюцыя аб адабрэнні мерапрыемстваў ЦК КПСС па пазыках.

ДЛЯ ДОБРАБЫТУ НАРОДА

Совецкая моладзь заўсёды актыўна падтрымлівала ўсякую ініцыятыву, накіраваную на паляпшэнне добрабыту народа і ўзмацненне сацыялістычнай дзяржавы.

Мы думаем, што выкажам думкі усіх студэнтаў філалагічнага факультэта, калі скажам, што мы аднадушна падтрымліваем мерапрыемствы, прапанаваныя партыяй і ўрадам па дзяржаўных пазыках.

Няхай больш будзе ў нашай краіне школ, жылых дамоў, клубаў, тэатраў!

Н. Бандарэнка, С. Шчэрба.

НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ КПСС

На пасяджэнні кафедры гісторыі КПСС абмяркоўваліся мерапрыемствы па падрыхтоўцы да саракавой гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Было вырашана ў кастрычніку гэтага года правесці ва універсітэце навуковую сесію, прысвечаную знамянальнай даце. Паміж членамі кафедры размеркаваны ужо тэмы дакладаў, якія будуць прачытаны на сесіі. Будзе таксама праведзена навуковая канферэнцыя студэнтаў. Для падрыхтоўкі канферэнцыі да кожнага факультэта замацаваны па два члены кафедры.

Распрацавана тэматыка лекцый і дакладаў, якія будуць прачытаны на працягу гэтага года ва універсітэце і ў горадзе Мінску. Кожнаму члену кафедры даручана падрыхтаваць 3—5 тэм. Сярод іх такія, як «Марксісцка-ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыята», «Гістарычнае значэнне Красавіцкай канферэнцыі (рыхтуе дацэнт Г. І. Якуб), «Стварэнне кадраў нацыянальнай штэлігенцыі у БССР». «Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя моладзі» (рыхтуе кандыдат гістарычных навук Н. С. Шавельская) і іншыя.

АБАРОНА ДЫПЛОМНЫХ РАБОТ

12 красавіка на кафедры гісторыі КПСС адбылася першая ў гэтым годзе абарона дыпломных работ студэнтамі-выпускнікамі гістарычнага факультэта.

З чатырох абараняючых двое атрымалі «выдатна» і двое «добра». На высокім ідэйным і навуковым узроўні напісаны работы Макарэвіча на тэму «Першыя рабочыя арганізацыі ў Расіі» (кіраўнік Рагожын) і Бадзілоускай на тэму «Красавщкія тэзісы В. І. Леніна—геніяльны план пераходу да соцыялістычнай рэволюцыі у Расіі» (кіраўнік Сікорскі). Гэтыя работы члены кафедры заслужана ацанілі самай высокай адзнакай.

Н. ІВАНША.

СЁННЯ Ў ГАСЦЯХ АРТЫСТЫ

Мала каму удаецца паглядзець новы спектакль яшчэ да прэм'еры. А студэнтам IV курса аддзялення журналістыкі пашанцавала, як нікому: «Оптимистическую трагедию» яны прагледзелі яшчэ ў дзень здачы спектакля. І вось сёння яны запрасілі да сябе артыстаў, каб абмеркаваць новую пастаноўку тэатра.

Першае слова кандыдат навук Е. Л. Бондарава прадаставіла дырэктару тэатра О. А. Гантману.

— Творы мастацтва патрабуюць вялікай напружанай працы над імі,—гаворыць ён.— І творчы калектыў нашага тэатра прыкладу многа намагаюся, прарабіў вялікую работу, каб ажыццявіць пастаноўку п'есы «Оптимистическая трагедия»—аднаго з класічных твораў рускай савецкай драматургіі. Тав. Гантман расказаў пра гісторыю стварэння спектакля, спыніўся на асобных момантах работы над ім.

Затым са сваімі заўвагамі выступілі студэнты.

— «Оптимистическая трагедия»—п'еса аб жалезнай волі комуністаў,—сказаў В. Мацкевіч.—Яна прасякнута пафасам рэвалюцыйнай барацьбы. Вось гэты пафас і здолелі данесці да гледача стваральнікі новага спектакля.

Цікавым было выступленне Галі Васкабойнікавай. Яна падрабязна спынілася на музычным афармленні спектакля, на асобных яго эпізодах. Гаворачы аб вялікай значымасці п'есы Вс. Вішнеўскага, Г. Васкабойнікава звярнула увагу на тую адказную задачу, што стаяла перад рэжысёрам.

На погляд Васкабойнікавай у спектаклі няўдалы фінал. Аб гэтым гаварылі В. Макарэвіч, З. Кац, В. Нікалаенка. Яны таксама спыніліся і на ігры артыстаў. Многа заўваг было выказана у адрас артыстаў, выконваючых роли вядучых (Еўлампіева і Сідарава). Усе гаварылі аб тым, што спектакль калектыву тэатра удаўся.

— Калі я глядзеў «Оптимистическую трагедию»,—сказаў В. Макарэвіч,—я забываў, што знаходжуся у тэатры.

Артыстка рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага А. І. Клімава гутарыць з групай студэнтаў.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

Цёпла сустрэлі студэнты выступленні артыстаў.

Аб сувязі мінулага з сучасным жыццём народа гаварыў народны артыст БССР А. Ф. Кістаў.

— Дабіцца увасаблення прауды жыцця—вось да чаго мы імкнуліся,—сказаў ён.

Аб стварэнні вобраза жанчыны-камісара расказала артыстка А. І. Клімава, марака Аляксея—заслужаны артыст БССР Г. К. Некрасаў.

Дырэктар тэатра О. А. Гантман падзяліўся з прысутнымі творчымі планамі тэатра на будучае. У яго рэпертуары будзе некалькі п'ес з гісторыі БССР гадоў Кастрычніцкай рэволюцыі і грамадзянскай вайны. Сярод іх «Стаука» Губарэвіча, «Улада» Кеслера. Вялікае значэнне падае тэатр творчаму супрацоўніцтву з драматургамі. Так, для тэатра па раману «Сустрэнемся на барыкадах» рыхтуе п'есу П. Пестрак, па раману «Крутыя горы»—Нікалай Вірта. З рускай класікі тэатр паставіць «Власть тьмы» Л. Талстога. Рыхтуецца да пастаноўкі камедыя «Калі цвіце акацыя».

Кожны, хто прыйшоў на сустрэчу, не шкадаваў аб гэтым.

І. ШУЦІК.

ДОБРЫ ПАЧАТАК

Днямі ва універсітэце адбыўся вечар сустрэчы студэнтаў з наватарамі вытворчасці, канструктарамі, інжынерамі.

У госці да студэнтаў прыйшлі начальнік канструктарскага бюро Мінскага трактарнага завода тав. Байкоў П. І., вядучы канструктар Мінскага аўтазавода А. З. Шапавалаў, інжынер радыёзавода ММТП БССР В. В. Кіслячэнка і наватар гэтага завода, рэгуліроўшчык цэха тэлевізарау Л. І. Кабернік.

У сваіх выступленнях яны расказалі студэнтам аб развіцці трактарнай тэхнікі, аб новых тыпах аўтамашын і звышмагутных самазвалах, тэлевізарах і радыёпрыёмніках. Шматлікія фатаграфіі дапамаглі студэнтам азнаёміцца з новымі відамі трактараў і аўтамашын, над стварэннем якіх працуюць нашы канструктары.

Сустрэча прайшла жыва і цікава. Госці адказалі на многія пытанні студэнтаў.

— Прыходзьце да нас, дарагія таварышы, і паглядзіце сваімі вачамі на нашу працу,—закончыў сваё выступленне Л. І. Кабернік.

Ад імя прысутных прарэктар універсітэта па навуковай рабоце Г. А. Павецьеу падзякаваў гасцей і пажадаў ім далейшых творчых поспехаў.

Пасля сустрэчы быу паказан кінофільм.

В. ДРАГУНОЎ.

Першакурсніцы аддзялення беларускай мовы і літаратуры Юля Жадан, Паліна Смародзіна і Тамара Дземянцей часцыя наведвальніцы кабінета замежных моў. Тут яны рыхтуюцца да чарговых лекцый, перакладаюць тэксты, чытаюць газеты. Першую сесію дзяўчаты здалі паспяхова. А зараз яны упорна рыхтуюцца да прадстаячых экзаменаў, у прыватнасці да экзамена па французскай мове.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

У ЛІТАРАТУРНЫМ ГУРТКУ

На пасяджэнні гуртка беларускай літаратуры абмеркавалі аповесць Рамана Сабаленкі «Юнацтва у дарозе». Даклад зрабіў Б. Сачанка. Ён грунтоўна прааналізаваў аповесць, адзначыў яе станоўчыя і адмоўныя бакі.

Усе выступаючыя гаварылі, што першы буйны празаічны твор Р. Сабаленкі удаўся. Асаблівыя спрэчкі разгарнуліся наконт мовы аповесці. Студэнты Р. Барадулін, В. Адамчык, І. Курбека адзначылі, што у мове аповесці сустракаюцца дыялектызмы, характэрныя пауднева-усходнім гаворкам. З гэтымі іх меркаваннямі не згадзіліся другія гурткоўцы, якія адзначылі, што аутар удала уводзіць у літаратуру словы, узятыя у народзе.

У заключэнне выступіў аутар. Ён падзякаваў гурткоуцаў за добрыя заўвагі, з некаторымі згадзіўся і сказаў, што зараз рыхтуецца прадоужыць работу над аповесцю.

Пісьменнік адказаў на рад пытанняў і прачытаў сваё новае апавяданне «Сюрпрыз».

Вынікі фестываля

Нядаўна адбылося пасяджэнне аркамітэта, на якім былі падведзены вынікі факультэцкіх фестываляў.

— Галоунае у тым, —сказаў старшыня аркамітэта Е. Бабосаў,—што фестываль вылучаецца вельми выгадна сярод звычайных вечароу. Добрае афармленне, сапраудная весялосць.

Выступіушыя потым члены аркамітэта тт. Лісіцын, Чыкілеуская, Герасіменка. адзначылі, чаго не хапала на фестывалях. Усе факультэты, акрамя фізмата, выпусцілі з-пад увагі спартыуныя выступленні. Дрэнна былі падрыхтаваны канцэрты мастацкай самадзейнасці на юрыдычным, гістарыным і геолага-геаграфічным факультэтах. Рэпертуар факультэцкіх канцэртаў быу выпадковым, не фестывальным. Ні на адным факультэце не было выставак падарункаў да фестывалю.

Аркамітэт аднадушна рашыу прысудзіць першае месца фізіка-матэматычнаму факультэту. Факультэт-пераможца будзе ўзнагароджан пераходным чырвоным сцягам рэктарата, профсаюзнай і комсамольскай арганізацый і каштоунымі падарункамі.

Адзначана таксама добрае правядзенне фестываляу на філалагічным і геолага-геаграфічным факультэтах.

І. ГАЛКІНА.

У ЦЕСНАЦЕ І КРЫЎДЗЕ

На абшарпаных дзвярах невялічкая шыльдачка: «Крыміналісцкая лабараторыя». Каля гарызантальнай рэпрадукцыйнай устаноукі, якая заняла амаль усё месца у цесным пакойчыку, таукуцца больш дзесятка юрыстау-трэцякурснікау. Выкладчык Мацвей Сямёнавіч Штэйнгауз расказвае студэнтам, як фатаграфаваць на устаноуцы розныя дакументы, рэчавыя доказы, як наводзіць на рэзкасць. Кожнаму хочацца сваімі рукамі памацаць апарат, паставіць дыяфрагму, або залажыць касету. Але удаецца гэта толькі самым дасціпным: часу мала, а група вялікая.

— Цесна у нашай лабараторыі,—гаворыць Мацвей Сямёнавіч.—Тут і прыборы усе, і шафы, і стэнды, і фоталабараторыя, і кабінет крыміналістыкі. Няма дзе развярнуцца па-сапраўднаму. Вось калі-б абсталявалі кабінет крыміналістыкі у асобным памяшканні, то хоць крыху пасвабаднела-б.

Аднак абсталяванне гэтага кабінета зацягваецца з-за адсутнасці стэндау. А навучанне студэнтау праходзіць на нізкім узроўні.

— Між тым заўсёды так было,—гаворыць старшы выкладчык Ніна Аляксандраўна Навасёлава.

Але бяда не толькі у гэтым. У лабараторыі не хапае усіх неабходных інструментау і прыбораў. Вельмі патрэбен электрычна-аптычны пераутваральнік інфрачырвоных прамянёу у бачымыя; для даследавання рэчавых доказаў неабходна ртутна-кварцавая лямпа; неабходны наглядныя дапаможнікі па раздзелу балістыкі.

Нават самае неабходнае для следства—следчы чамадан усяго толькі адзін на чатыры групы (75 чалавек). Гэта далёка не поўны пэралік таго, што патрэбна лабараторыі.

Аднак студэнты не могуць выкарыстаць поунасцю нават таго, што ёсць у лабараторыі. Яна увесь час знаходзіцца пад замком, калі не улічваць практычных заняткау. І гэта таму, што лабарант працуе усяго чатыры гадзіны у дзень—на палавіну стаукі. А работы у яго не на аднаго лабаранта: і гіпсам, і фотаматэрыяламі забяспечыць трэба, і рознымі дапаможнікамі.

— Сваімі рукамі усё гэта зрабілі,—не без гордасці гаворыць Віктар Пятровіч Ткачоу, паказваючы на добра афармленыя стэнды.

Пытанне аб лабаранце даўно ўжо ставілася, але да гэтага часу яшчэ не вырашана. А гэта прынесла-б вялікую карысць.

— Віктар Пятровіч—майстар на усе рукі,—гаворыць Мацвей Сямёнавіч,—і вопыт у яго вялікі. Ён змог-бы добра аформіць кабінет крыміналістыкі, і студэнты мелі-б магчымасць набываць практычныя навыкі не толькі на практычных занятках, але і у свабодны час.

Гэта тым больш неабходна, што па крыміналістыцы няма спецыяльных падручнікау. А кнігі, што выпускаюцца у вышэйшых юрыдычных установах, ва універсітэт не дасылаюцца.

У мінулым годзе усе гэтыя пытанні узнімаліся на старонках нашай газеты. Атрыман адказ вучэбнай часткі універсітэта, аднак і на сённяшні дзень у лабараторыі крыміналістыкі нічога не змянілася.

А. АКУЛІК.

ВЫПУСКНІКІ АТРЫМОЎВАЮЦЬ НАЗНАЧЭННЕ

У гэтым годзе наш універсітэт заканчваюць 83 юрысты. На маладых спецыялістаў з розных органаў юстыцыі БССР і РСФСР паступіла 104 заяўкі. 13 красавіка на юрыдычным факультэце адбылося размеркаванне выпускніку. Камісія па размеркаванню імкнулася ў першую чаргу задаволіць патрэбы сваёй рэспублікі у маладых спецыялістах. Таму большасць выпускніку застаецца працаваць на тэрыторыі Беларускай ССР. Некаторыя паедуць у РСФСР.

Справы, якія трэба ўладзіць

Пытанне аб цэнах, даступных для студэнтаў, ужо неаднаразова узнімалася. Калі ў буфеце можна тое-сёе купіць па параўнальна цярпімай цане, то ёсць іншыя гандлёвыя «універсітэцкія кропкі», якія скрадваюць студэнцкую стыпендыю. Гэта, у першую чаргу «кошыкі» на перапынках. Вядома, калі студэнт не паснедаў дома, ён купіць булку нават і за тры рублі. Таму і носяць сюды нейкія асаблівыя булкі па рублю з гакам у той час, як гэтыя-ж булкі прадаюцца ў горадзе па 70—80 капеяк. Справа ў тым, што нам іх прыносяць з рэстарана. Я думаю, у нас не рэстаран і любы студэнт з задавальненнем купіць булку за 41—53 капейкі.

Не першы раз узнімаецца пытанне і аб тым, як рыхтуюць абеды ў нашай сталовай. Вось якое бывае іншы раз варыва. У першых чыслах гэтага месяца я атрымала боршч, у якім плавала нейкая хвастатая істота, нагадваючая таракана. Гэта могуць пацвердзіць мае аднакурсніцы, якія абедалі разам са мной.

Дзе, напрыклад, падліва да катлет? Замест яе сухая каша з трэскамі ад дроў. А вінегрэт?! Яго нібы тапаром насекли. Не гавару ужо аб біточках, якія бываюць так «збіты», што ніякім нажом не разрэжаш.

Меню ў нашай сталоуцы «зімой і летам адным цветам», як кажуць. Хоць бы адно новае блюда паявілася.

Прафкому і грамадскім арганізацыям трэба звярнуць на усё гэта увагу.

АЛА ПЕСЕВА,
студэнтка II курса хімфака.

* * *

Дарагая рэдакцыя!

Многія студэнты, якія пражываюць да гэтага часу на прыватных кватэрах, вельмі занепакоены тым, што да гэтага часу ім не выдаюць грошы, якія яны павінны атрымаць.

Характэрна, што жыллёва-бытавы сектар прафкома універсітэта да гэтага часу не прадставіў спісы ў бухгалтэрыю. А яго кіраўнік В. Левы паводле гэтых непаразуменняў заявіў наступнае: «Я ў гэтым не зацікаўлены».

Цікава, што сказаў-бы ён тады, калі-б пражываў не ў інтэрнаце!

Група студэнтаў юрыдычнага факультэта.

Усесаюзная нарада па паляпшэнню падрыхтоўкі журналістаў ва універсітэтах СССР

Нарада, якая была склікана МВА СССР, праходзіла у Маскве з 8 па 12 красавіка гэтага года. На ёй былі заслуханы і абмеркаваны даклады: аб стане і мерапрыемствах па паляпшэнню падрыхтоўкі журналістаў у сістэме універсітэтаў, а таксама пытанні выкладання курса тэорыі і практыкі совецкага друку. Было узнята і пытанне аб навукова-даследчай рабоце па журналістыцы. На гэтую тэму зрабіў даклад выкладчык Ленінградскага універсітэта А. Ф. Берэжной.

Вялікую цікавасць выклікаў даклад на тэму «Роля і месца вучэбнай газеты у падрыхтоўцы журналістаў». М. В. Ільін, рэдактар вучэбнай газеты «Журналіст», якая выдаецца факультэтам журналістыкі Маскоускага універсітэта, расказаў аб яе рабоце. Газета «Журналіст» друкуецца у створанай пры факультэце вучэбна-паліграфічнай лабараторыі.

Былі заслуханы таксама даклады аб арганізацыі завочнага навучання і аб вучэбных планах факультэтаў і аддзяленняў журналістыкі.

На пасяджэннях секцый абмеркаваны праекты праграм па тэорыі і практыцы партыйна-совецкага друку, яго гісторыі, літаратурнаму рэдагаванню, практычнай стылістыцы і г. д.

У сваіх рэкамендацыях Міністэрству вышэйшай адукацыі СССР нарада прызнала неабходным прымаць на факультэты і аддзяленні журналістыкі галоўным чынам асоб, якія прапрацавалі па 2—3 гады у газетах. Нарада мяркуе мэтазгодным перабудаваць вучэбныя планы па журналістыцы за лік скарачэння асобных моваведчых і іншых дысцыплін з тым, каб павялічыць і узмацніць удзельную вагу практычных і семінарскіх заняткаў па спецыяльных прадметах і вучэбна-вытворчай практыцы. Практыку трэба павялічыць з 16 да 24 тыдняў. У якасці абавязковых прадметаў нарада прапанавала увесці стэнаграфію, машынапіс, фотарэпартаж. На факультэтах і аддзяленнях журналістыкі трэба стварыць лабараторыі-друкарні, на базе якіх наладзіць выпуск вучэбных газет з прыцягненнем да іх выпуску студэнтаў II—IV курсаў.

М. С. ЗЯРНІЦКІ,
загадчык кафедры партыйнага і совецкага друку.

Хто яны, гэтыя двое юнакоў з насцярожанымі задумёнымі тварамі—радыётэхнікі, ці радыёаматары? Так, апошняе будзе беспамылковым. У свабодны час студэнты V курса фізіка-матэматычнага факультэта Антон Сарока і Іван Поварго па схеме збіраюць чатырохлямпавы прыёмнік. Дарэчы, ужо другі...

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

СКАРАЦІЦЬ КОЛЬКАСЦЬ ЛЕКЦЫЙ

Ужо многа год на розных пасяджэннях абмяркоўваюць амаль адно і тое-ж пытанне: як павысіць паспяховасць студэнтаў? Аднак справа наперад рухаецца слаба.

Гавораць і спрабуюць даказаць, што добры студэнт можа справіцца з усімі цяжкасцямі у вучобе, можа прачытаць за суткі 1—2 раманы, праслухаць 6—8 гадзін лекцый, зрабіць усё неабходнае у быту, падрыхтавацца як след да практычных заняткаў, схадзіць у кіно, наведаць тэатрь. і г. д. Няма патрэбы пералічваць усё тое, што можа зрабіць гэты руплівы студэнт за адзін дзень. Звычайна для прыкладу прыводзяць студэнтаў, якія сядзяць дзень і ноч за кнігамі, мала займаюцца або зусім не займаюцца грамадскай працай. Гэта «чыстыя» выдатнікі. Але і яны, паводле іх слоў, ніяк не могуць выканаць вучэбны план на 100 працэнтаў.

Разгледзім больш падрабязна, з чаго складваецца працоўны дзень сярэдняга па здольнасцях студэнта.

На нашым факультэце кожны дзень бывае па 6—8 гадзін лекцыйных заняткаў, прычым, часта лекцыі чытаюцца у розны час, працоўны дзень аказваецца разбітым. Дзве гадзіны адвядзем на сняданне, абед і вячэру, 7—8 гадзін на сон. Застаецца 7—8 гадзін свабоднага часу. А калі ўлічыць выкананне грамадскай працы, заняткі у гуртках, культурны адпачынак, то часу для самастойнай працы застаецца яшчэ менш. Цяпер можна запытацца, ці магчыма за 7—8 гадзін вольнага часу падрыхтавацца да практычных заняткаў, якія бываюць кожны дзень, здаць усе «тысячы», прачытаць тэксты па зарубежнай, рускай і беларускай літаратурах і зрабіць многае іншае.

Трэба ўлічваць, што студэнт жывы чалавек, а не механізм, які можа перагортваць старонкі рамана з хуткасцю аутамата. А такі спосаб чытання літаратуры прапануваў загадчык кафедры педагогікі на адным з партыйных сходаў: студэнт можа прачытаць ліст кнігі за 3 мінуты. А гэта значыць пераскокваць з радка на радок, не унікаць у сэнс прачытанага, гнацца за колькасцю «прачытаных» кніг, а ведаць мала. Каб глыбока засвоіць матэрыял, трэба чытаць удумліва, з алоўкам у руках, а гэта нельга зрабіць за 3 мінуты.

Усё гэта я гавару к таму, што студэнт павінен мець больш свабоднага часу. Дзе яго ўзяць? Справа у тым, што студэнт—чалавек дарослы і у многіх пытаннях можа разабрацца сам, а лекцыя павінна быць не тлумачэннем усіх пунктаў праграмы, а даваць аснову ведаў. Некаторыя прадметы маюць многа агульнага матэрыялу. Узяць, напрыклад, гісторыю рускай і беларускай моў. У гэтых курсах 35—40 працэнтаў агульнага, і гэтае агульнае можна паутарыць па падручніку. Можна не чытаць на лекцыях і біяграфіі пісьменнікаў, якіх студэнты ведаюць з сярэдняй школы.

Прадуманая, правільная сістэма выкладання дала-б магчымасць разгрузіць студэнтаў, знайсці больш часу для самастойнай працы. Такім чынам можна было-б адвесці хоць адзін дзень у тыдзень для працы у кабінетах, бібліятэках і г. д.

Тады і выдатнікаў будзе больш і часу хопіць на усё—і на вучобу, і на культурны адпачынак, і на грамадскую працу.

К. КАЖАН,
студэнт II курса філфака.

БЫЛО-Б ЖАДАННЕ...

(аб спартыўнай рабоце на філфаку)

У параўнанні з мінулым годам фізкультурная работа на філалагічным факультэце пастаўлена значна лепш.

Філфак нядрэнна выступае па такіх відах спорту, як шахматы, шашкі, лёгкая атлетыка, баскетбол. Добрымі арганізатарамі паказалі сябе Новікаў, Будай, Чэмярыцкі, Нікалаеў і іншыя.

Але трэба сказаць, што большасць членаў факультэцкага бюро ДСТ «Буравеснік» недастаткова сур'ёзна адносіцца да выканання сваіх абавязкаў.

Член бюро, адказны за лыжны спорт т. Скапа абыякава адносіўся да сваёй справы. Лыжная секцыя працавала вельмі дрэнна і толькі перад пачаткам спаборніцтваў Скапа пачаў праяўляць максімум энергіі. Але было позна. Каманда аказалася непадрыхтаванай і вымушана была «задаволіцца» апошнім месцам.

Па праграме круглагадавой спартакіяды засталіся яшчэ гімнастыка, плаванне, вясенні крос, з якімі на факультэце не усё добра.

Бечык, член бюро ДСТ «Буравеснік»—адказны за плаванне па факультэту,—амаль нічога не робіць, ды і сам не наведвае секцыю. Па словах трэнера Собалевай, ён прыходзіць у басейн толькі пакупацца. Дрэнна наведваюць секцыю студэнты Лепесін і Бандарэнка. І гэта застаецца па-за увагай комсамольскай арганізацыі факультэта.

У справе прапаганды спорту важнейшую ролю павінна адыгрываць факультэцкая газета «Спартсмен філфака» (рэдактар Чэпікаў).

У гэтым годзе выйшлі два нумары газеты. У апошнім нумары падводзяцца вынікі спаборніцтваў па валейболу, лыжах, лёгкай атлетыцы у зімовых умовах. Аднак матэрыял пададзен суха, без яркіх ілюстрацый. Няма у газеце вострай крытыкі недахопаў. Відаць, што Чэпікаў фармальна аднёсся да выпуска насценнай газеты.

Зірнуўшы на спартыўны стэнд філфака, можна падумаць спачатку, што афармленне стэнда—справа надзвычай цяжкая. Але гэта зусім не так. Непрыстойны выгляд спартыўнай «дошкі гонару» сведчыць аб безадказнасці таварышаў, якім даручана гэтая справа. Цяпер на стэндзе замест фатаграфіі лепшых спартсменаў факультэта «красуецца» насценная газета «Спартсмен філфака».

Вось гэта найлепшы выхад з «крытычнага» становішча, у якім апынулася т. Роніс, член бюро, адказная за афармленне стэнда!

М. ФІЛІНАЎ.

□ □ □

Чацверты год у гімнастычнай секцыі займаецца студэнтка геолага-геаграфічнага факультэта Лена Шэшмінцава. Зараз яна працуе па праграме першага разраду.

НА ЗДЫМКУ: Лена Шэшмінцава выконвае практыкаванне на буме.

Фізкультура і спорт

Барацьба была цікавай



Закончылася камандпае першынство па шахматах, якое працягвалася цэлы тыдзень. У спаборніцтвах прынялі удзел каманды усіх факультэтаў універсітэта. У састаў кожнай каманды уваходзіла шэсць мужчын і адна жанчына. Усе 147 сустрэч насілі востры, напружаны характар.

У першых турах мінулагодні чэмпіён (каманда фізмата) у сустрэчы з гісторыкамі ледзь не пацярпела паражэнне, звёўшы гульню на нічэйны вынік.

У другім туры каманда філфака, якая заняла у мінулым годзе трэцяе месца, зрабіла нічыю з камандай хімфака. У далейшым вынік каманд філфака і фізмата вырауняўся.

Фізмат атрымаў перамогу над камандамі геолага-геаграфічнага (6½:1½), біёлага-глебавага (7:0) і юрыдычнага (5½:1½) факультэтаў.

Філолагі ўсе свае намаганні накіравалі на тое, каб заняць другое месца. Ім прышлося вытрымаць барацьбу з камандай гістарычнага факультэта, якая таксама прэтэндавала на другое месца. Таму сустрэча паміж гэтымі камандамі была вельмі напружанай.

... Да адзінаццаці гадзін вечара, калі адбудзецца прысуджэнне незакончаных партый, засталося некалькі мінут. Лік сустрэчы паміж гісторыкамі і філолагамі пакуль што 4½:½. Засталося дзве партыі. У адной з іх у Несцяровіча (філалагічны факультэт) лішняя фігура, якая можа вырашыць выход партыі ў яго карысць. Аднак Несцяровіч паспяшаўся. Ён робіць паспешны размен. Партыя закончылася нічыю. Агульны лік 5:2 у карысць філфака.

У наступных турах каманда філфака выиграла у каманд біёлага-глебавага, геолага-геаграфічнага і юрыдычнага факультэтаў. У апошнім туры сустрэліся мацнейшыя канкурэнты: фізмат—філфак, геолага-геаграфічны і юрыдычны факультэты.

У сустрэчы гісторыкаў з геолага-геаграфічным факультэтам ні адной з каманд не удалося дабіцца перавагі, і гульня закончылася нічыю. Такі-ж зыход мог-бы паутарыцца і у каманд фізмата і філфака, але А. Балаш (філфак) у выйграшнай пазіцыі зрабіў нічыю. Перамаглі шахматысты фізмата з лікам 4:3.

Першае месца, заваявала каманда фізмата, якая набрала 33 ачкі. На другім месцы—шахматысты філалагічнага факультэта з 27 ачкамі. Трэба адзначыць, што камандзе філфака іншы раз не хапае вытрымкі, што прывяло да страты некалькіх ачкоў.

Трэцяе месца заняла каманда гістарычнага факультэта, набраўшая 25 ачкоў. На поўачка адстала ад гісторыкаў каманда геолага-геаграфічнага факультэта, яна прыкметна знізіла клас гульні. Далей ідуць каманды хімічнага факультэта (19 ачкоў) юрыдычнага (13 ачкоў) і біёлага-глебавага (5½ ачка).

Лепшы асабісты вынік паказала Эпштэйн (фізмат). Яна выиграла усе шэсць партый.

Пераможцамі на сваіх дошках сталі Балаш (філфак), Гараеў (хімфак), Грудо (фізмат), Патапенка (гістфак), Нікіфаровіч (філфак) і Наумовіч (фізмат).

І. ДОНАЎ.

НА ЗДЫМКУ: Студэнты Новікаў (філфак) і Русевец (геафак) іграюць чарговую партыю турніра.

ДЗЕНЬ ДРУКУ

Дарагія чытачы!

У сувязі з падрыхтоўкай да Дня друку рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» просіць Вас адказаць на наступныя пытанні:

1. Якія артыкулы, карэспадэнцыі, заметкі, малюнкі, фельетоны, змешчаныя ў нашай газеце, Вам запомніліся і спадабаліся?

2. Якія пытанні, на Вашу думку, слаба асвятляюцца ў газеце?

3. Ці задавальняе Вас асвятленне вучэбнай, навукова-даследчай, выхаваўчай работы, а таксама работы партыйнай, комсамольскай і профсаюзнай арганізацый?

4. Што-б Вы хацелі пачытаць у газеце па пытаннях падрыхтоўкі да фестывалю, аб рабоце студэнцкай мастацкай самадзейнасці, фізкультуры і спорту?

Чакаем Вашых пажаданняў па паляпшэнню работы газеты.

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».

Рэдактар А. ВОЛК.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01454 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 458 Тыраж 2000